УДК 808.2

У.І. Кулікові, дац., канд. філал. навук (БДТУ, г. Мінск)

# ЛЕКСІКАГРАФІЧНЫЯ ВЫДАННІ СУЧАСНАСЦІ

Для беларускамоўнага соцыуму актуальнасць падрыхтоўкі, выпуску ў свет і распаўсюджання лексікаграфічных прац абумоўлена шэрагам прычын: 1) уступленне ў дзеянне Закона Рэспублікі Беларусь «Аб правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі» (2008) і аб’ектыўная неабходнасць упарадкаваць корпус лексічных адзінак у адпаведнасці з новымі арфаграфічнымі прадпісаннямі; 2) патрэба ліквідаваць шматгадовае адставанне ад з’яўлення новага факта грамадскага жыцця, да яго фіксацыі ў адпаведным слоўніку; 3) стварэнне станоўчага іміджу беларускай лексічнай сістэмы; 4) падняцце прэстыжу мовы ў грамадстве; 5) забеспячэнне высокіх тэмпаў развіцця нацыянальнага мовазнаўства; 6) практычныя патрэбы школы, выдавецкага комплексу.

Вырашэнню названых задач спрыяюць тры разнапланавыя слоўнікі, падрыхтаваныя А. Каўрусам («Словаклад: слоўнік адметнай лексікі» — Мінск: Выдавецкі дом «Звязда», 2013. — 328 с. Тыраж 700 экз.); Л. Яўдошынай і Г. Малажай («Школьны тлумачальны слоўнік беларускай мовы: дапам. для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання» — Мінск: Аверсэв, 2013. – 478 с. Тыраж 5100); К. Шчаснай («Слоўнік новай і актуальнай лексікі» — Мінск: Права і эканоміка, 2012. — 102 с. Тыраж 100 экз.).

Першы даведнік уключае каля 2000 слоў, якія не фіксаваліся нашымі акадэмічнымі слоўнікамі, аднак часцяком выкарыстоўваліся ў публіцыстыцы і мастацкай літаратуры. Ён адлюстроўвае самабытнасць беларускай мовы ў параўнанні з рускай, дазваляе прасачыць і ўбачыць шляхі папаўнення асобных лексіка-семантычных груп.

Лексікаграфічны даведнік Г. Малажай аб’ёмам каля 4000 слоў адрасаваны школьнікам. Яго задача — садзейнічаць узбагачэнню слоўніка дзяцей і падлеткаў, актывізаваць іх маўленчую дзейнасць, «дапамагчы акрэсліць значэнні многіх слоў, якія цяжка самастойна вытлумачыць, чытаючы мастацкія, публіцыстычныя і навуковыя тэксты».

У трэцім выданні змяшчаецца 556 новых лексічных адзінак: словы, незафіксаваныя ў ранейшых лексікаграфічных працах (*амігурумі*, *зорбінг, каўчсёрфінг* і інш.); словы, вядомыя у лексікаграфічнай практыцы, аднак з іншым лексічным значэннем (*аватар*, *апавяшчальнік*, *жахліўчык* і інш.); словы, якія існавалі ў мове працяглы час, але толькі на сучасным этапе ўвайшлі ў разрад высокачастотных (*абвестка*, *кухар* і інш.).

Даведнікі аспрэчваюць ганебны тэзіс пра нежыццяздольнасць і функцыянальную непаўнавартаснасць нашай мовы.